Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
_____________ В.Р.Языковіч
_____ 16.01 _____ 2020

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
**Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў**
спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 02.08.2016 г., рэг. № 25-13/185

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2020

Распрацоўшчыкі праграмы:
*Н.Ю. Бярозкіна*, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А.В. Прадзеіна*, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» кандыдат педагагічных навук;
*А.І. Фядорына*, дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*І.В. Юрык*, дырэктар Навуковай бібліятэкі УА «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

Савет Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 16.01.2020 № 1

## УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў» складзена згодна з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 1-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

**Мэта** праграмы: даць ўяўленне аб апрацоўцы дакументаў як цэласнай сістэме, якая вызначае асноўныя працэсы бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыі, прадметызацыі і каардынатнага індэксавання, актуальных праблемах развіцця аналітыка-сінтэтычнай апрацоўцы дакументаў і перспектывах яе развіцця.

**Задачы** праграмы:

сфарміраваць прафесійныя веды, уменні, навыкі ў слухачоў у галіне бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыі, прадметызацыі і каардынатнага індэксавання;

сфарміраваць уяўленне аб нарматыўна-метадычным забеспячэнні аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў;

даць тэарэтычныя асновы складання бібліяграфічных запісаў дакументаў;

навучыць спосабам і метадам фарміравання бібліяграфічнага запісу;

навучыць спосабам і метадам індэксавання дакументаў;

даць суцэльную характарыстыку бібліятэчным каталогам;

выпрацаваць ў слухачоў уменні і навыкі валодання традыцыйнай і аўтаматызаванай тэхналогіямі апрацоўкі дакументаў на традыцыйных і машыначытальных носьбітах.

**Метады** навучання: традыцыйныя (метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады кантролю і самакантролю); актыўныя; інтэрактыўныя.

**Сродкі павышэння кваліфікацыі:** аўдыяльныя, візуальныя, аўдыявізуальныя.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання** ў рамках праграмы.

Слухачы павінны:

*ведаць*:

сутнасць аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў;

шляхі стварэння і асаблівасці функцыянавання сучасных інфармацыйна-пошукавых сістэм, іх ролю і месца ва ўстановах дакументна-камунікатыўнай сферы;

нарматыўна-метадычныя матэрыялы па аналітыка-сінтэтычнай апрацоўцы дакументаў, стандарты па фарміраванню бібліяграфічнага запісу і індэксаванню дакументаў, табліцы бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі;

тэорыю, методыку і тэхналогію апрацоўкі дакументаў і арганізацыі бібліятэчных каталогаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэорыю, методыку і тэхналогію арганізацыі, вядзення і рэдагавання каталогаў розных відаў;

*умець*:

фарміраваць бібліяграфічны запіс для інфармацыйна-пошукавых сістэм бібліятэк;

індэксаваць (сістэматызацыя, прадметызацыя і каардынатнае індэксаванне дакументаў);

арганізаваць, рэдагаваць, выкарыстоўваць каталогі бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | Лабараторныя заняткі | Дзелавыя гульні | Трэнінгі | Канферэнцыі | Самастойная работа |
| 1 | Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў. Тэарэтычныя асновы складання бібліяграфічных запісаў дакументаў | 2 | 2 | | | | | | | | |
| 2 | Агульная методыка бібліяграфічнага апісання | 8 | 2 | 2 | | | | | | | 4 |
| 3 | Аднаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне | 2 | 2 | 2 | | | | | | | |
| 4 | Загаловак бібліяграфічнага запісу дакументаў | 8 | 2 | 2 | | | | | | | 4 |
| 5 | Многаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне | 4 | 2 | 4 | | | | | | | |
| 6 | Прыватная методыка складання бібліяграфічнага запісу на асобныя віды дакументаў | 14 | 2 | 4 | | | | | | | 4 |
| 7 | Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя | 6 | 2 | | | | | | | | 4 |
| 8 | Універсальная дзесятковая класіфікацыя | 2 | 2 | | | | | | | | |
| 9 | Агульная методыка сістэматызацыі | 6 | 2 | 2 | | | | | | | |
| 10 | Прыватная методыка сістэматызацыі | 8 | 2 | 2 | | | | | | | 4 |
| 11 | Методыка каардынатнага індэксавання | 2 | | 2 | | | | | | | |
| 12 | Бібліятэчныя каталогі: функцыі, асноўныя прынцыпы стварэння, віды і формы | 8 | 2 | 4 | | | | | | | 4 |
| | **Усяго:** | **70** | **22** | **24** | | | | | | | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Тэма 1. Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў. Тэарэтычныя асновы складання бібліяграфічных запісаў дакументаў

Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў (АСАД) як вучэбная дысцыпліна. Узаемасувязь дысцыпліны «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў» з агульнанавуковымі і спецыяльнымі дысцыплінамі. Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне АСАД. Паняцці «аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў» і «аналітыка-сінтэтычная перапрацоўка дакументаў», іх сутнасць, адрозненне. Дакумент як аб’ект аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі і крыніца фарміравання бібліяграфічнага запісу. Агульная характарыстыка і ўзаемасувязь аналітычнага і сінтэтычнага метадаў аналізу пры апрацоўцы дакументаў. Віды бібліятэчнай апрацоўкі дакумента: характарыстыка, вынік. Бібліяграфічны запіс: вызначэнне, структура, функцыі, прынцыпы, віды. Роля апрацоўкі дакумента ва ўстановах сістэмы дакументных камунікацый.

### Тэма 2. Агульная методыка бібліяграфічнага апісання

Бібліяграфічнае апісанне: сутнасць, прызначэнне, функцыі. Віды бібліяграфічнага апісання ў адпаведнасці з аб’ектам. Структура, элементы бібліяграфічнага апісання. Крыніцы інфармацыі для складання бібліяграфічнага апісання. Прадпісаныя знакі пунктуацыі. Мова бібліяграфічнага апісання. Выкарыстанне скарачэнняў. Арфаграфія.

### Тэма 3. Аднаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне

Вызначэнне паняцця. Вобласці і элементы бібліяграфічнага апісання. Іх характарыстыка, паслядоўнасць. Абавязковыя і факультатыўныя элементы, іх роля і прызначэнне пры фарміраванні бібліяграфічнага апісання. Этапы складання аднаўзроўневага бібліяграфічнага апісання.

Асноўны запіс. Яго роля, аб’ём звестак, залежнасць ад выбару першага элемента бібліяграфічнага запісу (пад загалоўкам і пад назвай).

Дадатковыя запісы, іх віды, прызначэнне і выкарыстанне.

### Тэма 4. Загаловак бібліяграфічнага запісу дакумента

Паняцце «загаловак». Агульныя патрабаванні да загалоўка бібліяграфічнага запісу і правілы яго складання: набор звестак, паслядоўнасць іх прывядзення, прымяненне прадпісанай пунктуацыі. Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам. Віды загалоўкаў бібліяграфічнага запісу. Асноўныя правілы фарміравання бібліяграфічнага запісу пад загалоўкам, які ўключае імя асобы. Асаблівасці фармулёўкі імён



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(прозвішчаў) аўтараў розных народаў. Факультатыўнасць аўтарскага загалоўка.

Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам, які ўключае назву арганізацыі.

Форма, структура і правілы прывядзення загалоўкаў, якія ўключаюць уніфікаваную назву, абазначэнне дакумента, геаграфічную назву.

Агульная характарыстыка «ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления».

## Тэма 5. Многаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне

Асаблівасці складання многаўзроўневага бібліяграфічнага запісу. Многаўзроўневы бібліяграфічны запіс на мнагатомныя выданні. Бібліяграфічны запіс асобнага тома многатомнага выдання і яго варыянты.

Складанне бібліяграфічнага запісу на серыяльныя дакументы (выданні, якія працягваюць выходзіць, перыядычныя і серыйныя).

Многаўзроўневы бібліяграфічны запіс на мнагатомныя выданні. Бібліяграфічны запіс асобнага тома многатомнага выдання і яго варыянты.

Складанне бібліяграфічнага запісу на серыяльныя дакументы (выданні, якія працягваюць выходзіць, перыядычныя і серыйныя).

Складанне бібліяграфічнага апісання на састаўную (аналітычную) частку дакумента. Схема аналітычнага апісання. Значэнне звестак, якія ідэнтыфікуюць састаўную частку, і правілы іх прывядзення ў бібліяграфічным апісанні. Асаблівасці аналітычнага бібліяграфічнага апісання асобнага твора са збору твораў і зборнікаў, дакументаў з серыяльных выданняў. Бібліяграфічнае апісанне главы, раздзела, параграфа, рэцэнзій.

## Тэма 6. Прыватная методыка складання бібліяграфічнага запісу на асобныя віды дакументаў

Бібліяграфічны запіс зборнікаў. Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам і пад назвай. Раскрыццё зместу зборнікаў з агульнай назвай.

Складанне бібліяграфічнага запісу на нарматыўна-тэхнічныя і тэхнічныя дакументы, дэпаніраваныя рукапісы і неапублікаваныя дакументы.

Спецыфіка бібліяграфічнага запісу нотных выданняў і аўдыявізуальных матэрыялаў. Апісанне выяўленчых і картаграфічных выданняў.

Асаблівасці бібліяграфічнага запісу электронных рэсурсаў (электронных выданняў).

Методыка стварэння бібліяграфічных запісаў на нацыянальныя дакументы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя (ББК)

ББК як іерархічная ўніверсальная камбінацыйная сістэма класіфікацыі. Асаблівасць ББК, яе прынцыповыя асновы. Структура ББК: асноўныя табліцы, дапаможныя табліцы (табліцы тыпавых дзяленняў), алфавітна-прадметны паказальнік (АПП). Індэксацыя табліцы. Варыянты табліц ББК, іх характарыстыка. Машыначытальная версія ББК (БД ББК). Пошукавыя магчымасці БД ББК.Удасканаленне табліц ББК як інфармацыйна-пошукавай мовы.

## Тэма 8. Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК)

УДК як іерархічная ўніверсальная камбінацыйная сістэма класіфікацыі. Прынцыпы і ўласцівасці пабудовы, сутнасць, спецыфіка УДК. Структура УДК: асноўныя табліцы, дапаможныя табліцы (агульныя і спецыяльныя вызначальнікі), алфавітна-прадметны паказальнік (АПП). Індэксацыя і сінтаксічныя знакі. Правілы індэксавання. Варыянты табліц УДК. Машыначытальная версія УДК (БД УДК). ГОСТ 7.90–2007 «Универсальная десятичная классификация. Структура, правила ведения и индексирования». Дзейнасць Кансорцыума УДК. Роля НББ у развіцці УДК на беларускай мове. Беларускамоўнае выданне УДК: склад, спецыфіка. Актуалізацыя і выкарыстанне табліц УДК у якасці інфармацыйна-пошукавай мовы ў навуковых і іншых бібліятэках, органах НТІ Беларусі.

## Тэма 9. Агульная методыка сістэматызацыі

Паняцце «сістэматызацыя» і яе задачы. Аб’ект сістэматызацыі.

Агульная і прыватная методыкі сістэматызацыі. Сувязь методыкі сістэматызацыі з табліцамі класіфікацыі. Метады шматразовага адлюстравання і аналітычнай сістэматызацыі, іх значэнне для шматаспектнага раскрыцця зместу фонду.

Прынцыпы, метады і правілы сістэматызацыі.

Тэхналагічныя працэсы сістэматызацыі дакументаў, іх сутнасць і паслядоўнасць. Віды класіфікацыйных індэксаў у залежнасці ад функцый, якія яны выконваюць. Класіфікацыйная формула і яе значэнне.

## Тэма 10. Прыватная методыка сістэматызацыі

Структура аддзелаў, асноўныя дзяленні і іх напаўненне. Наяўнасць і выкарыстанне дапаможных табліц, сувязі і размежаванні аддзелаў.

Сістэматызацыя дакументаў гістарычнай, гуманітарнай тэматыкі, мастацкай літаратуры. Спецыфіка афармлення класіфікацыйнага рашэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 11. Методыка каардынатнага індэксавання

Асноўныя этапы каардынатнага індэксавання. Аналіз зместу дакумента і выяўленне ключавых слоў. Фарміраванне пошукавага вобраза дакумента з дапамогай тэзаўруса. Прадметызацыя як від індэксавання дакументаў.

## Тэма 12. Бібліятэчныя каталогі: функцыі, асноўныя прынцыпы стварэння, віды і формы

Бібліятэчны каталог. Функцыі каталогаў як падсістэмы даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі. Прынцыпы фарміравання бібліятэчных каталогаў. Класіфікацыя бібліятэчных каталогаў па прыметам: характар адлюстроўваемых прымет, віды адлюстроўваемых дакументаў, мэтавае назначэнне, ахват фондаў, характар функцыянавання, форма прадстаўлення.

Стварэнне і выкарыстанне каталогаў. Алфавітны каталог. Сістэматычны каталог. Прадметны каталог. Электронны каталог. Зводны каталог. Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі. Рэгіянальныя зводныя электронныя каталогі. Імідж-каталог.

Сістэма бібліятэчных каталогаў. Арганізацыя, вядзенне, рэдагаванне традыцыйных карткавых каталогаў. Тэхналогія работы з электронным каталогам. Якасць каталогаў і эфектыўнасць іх выкарыстання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ

### Тэма 2. Агульная методыка бібліяграфічнага апісання

*Пытанні*

1. Дакумент як аб'ект для складання бібліяграфічнага апісання.
2. Бібліяграфічнае апісанне: вызначэнне, структура, функцыі, віды.
3. Прадпісаная пунктуацыя: склад, назначэнне, характарыстыка.
4. Вобласці і элементы бібліяграфічнага апісання: характарыстыка, прыклады элементаў.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*


1. ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення. – Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82 ; введ. 2004–11–01. – Минск, 2004. – 48 с.
2. ГОСТ 7.11–2004. Библиографическая запись. Сокращение слов и словосочетаний на иностранных европейских языках = Бібліяграфічны запіс. Скарачэнне слоў і словазлучэнняў на замежных еўрапейскіх мовах. — Взамен ГОСТ 7.11–78 ; введ. 2005–09–01. — Минск : БелГИСС, 2005. — 83 с.
3. СТБ 7.53–2019. Издания. Международный стандартный книжный номер. Использование и издательское оформление = Выданні. Міжнародны стандартны кніжны нумар. Выкарыстанне і выдавецкае афармленне. – Взамен ГОСТ 7.53–2008; введ. 2019–11–01. – Минск, 2019. – 8 с.
4. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А.В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 52–88 ; 90–97.
5. Асеева, И. Ю. Стабильность и развитие: национальный стандарт ГОСТ Р 7.0.100-2018 "Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления" / И. Ю. Асеева, Т. А. Бахтурина // Библиография. – 2018. – №6. – С. 13–24.
6. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэбны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 11–21 ; 46–84. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/15728/%d0%9b%d0%b5%d0%b9%d0%ba%d0%be.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступу : 17.12.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Загаловак бібліяграфічнага запісу дакумента

*Пытанні*

1. Загаловак бібліяграфічнага запісу дакумента: паняцце, агульныя патрабаванні, правілы складання: набор звестак, паслядоўнасць іх прывядзення, прымяненне ўмоўных раздзяляльных знакаў.
2. Правілы фарміравання і прыклады розных відаў загалоўкаў бібліяграфічнага запісу дакумента:

загаловак, які ўключае імя асобы;
загаловак, які ўключае назву арганізацыі;
загаловак, які ўключае уніфікаваную назву;
загаловак, які ўключае абазначэнне дакумента;
загаловак, які ўключае геаграфічную назву.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления. – Введ. 2001-11-01. – Минск, 2001. – 8 с.
2. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 52–88 ; 90–97.
3. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэбны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 73–81. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/15728/%d0%9b%d0%b5%d0%b9%d0%ba%d0%be.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступу : 17.12.2017.

## Тэма 6. Прыватная методыка складання бібліяграфічнага запісу на асобныя віды дакументаў

*Пытанні*

1. Скласці бібліяграфічны спіс літаратуры, які ўключае бібліяграфічныя запісы на:

зборнікі;
нарматыўна-тэхнічныя і тэхнічныя дакументы;
нотныя выданні;
аўдыявізуальныя матэрыялы;
выяўленчыя выданні;
электронныя рэсурсы (выданні)
аналітычныя бібліяграфічныя апісанні на:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобны твор са збору твораў і зборнікаў;
главу, раздел, параграф;
публікацыі з серыяльных выданняў;
рэцэнзіі.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*


1. ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення. – Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82 ; введ. 2004–11–01. – Минск, 2004. – 48 с
2. СТБ 7.38–2017. Электронные издания. Основные виды и выходные сведения = Электронныя выданні.Асноўныя віды і выхадныя звесткі. – Введен впервые 2017–10–01.– Минск, 2017. – 16 с.
3. ГОСТ 7.82–2001. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления=Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных рэсурсаў. Агульныя патрабаванні і правілы складання. – Введ. 2003–01–01. – Минск, 2002. – 23 с
4. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 52–88 ; 90–97.
5. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэбны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 85–153. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/15728/%d0%9b%d0%b5%d0%b9%d0%ba%d0%be.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступу : 17.12.2017.


## Тэма 7. Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя

*Пытанні*

1. Структура ББК.
2. Варыянты табліц ББК.
3. Характарыстыка ББК, якая выкарыстоўываецца ў бібліятэцы (месца працы слухача).

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*


1. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В.Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С.162–168 ; 170 –181.

2. Библиотечно-библиографическая классификация (ББК) : общий обзор, анализ и оценка Национальной классификационной системы Российской Федерации / Э. Р. Сукиасян. – Москва : Литера, 2014. – 312 с. – (Современная библиотека).

3. Библиотечно-библиографическая классификация: [ББК] : сокращенные таблицы : практическое пособие / Российская государственная библиотека, Российская национальная библиотека, Библиотека Российской академии наук ; [А. С. Адаменко и др.; главный редактор Э. Р. Сукиасян]. – Москва: Пашков дом, 2015. – 669, [2] с.

4. Библиотечно-библиографическая классификация : средние таблицы. – М. 2001 – 2018. – Вып. 1 – 7.

5. ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2006-03-01. – Минск, 2006. – 5 с.

6. Зайцева, Е. М. Перспективы развития библиотечных классификаций: взгляд систематизатора и автоматизатора [Электронный ресурс] / Е. М. Зайцева // Перспективные направления научных исследований и критические технологии в классификационных системах : научно-практическая конференция, Москва, 25–27 октября, 2017 г. : материалы конференции / ВИНИТИ РАН ; науч. ред. Дмитриева Е.Ю. [и др.]. – Москва, 2017.– С. 44–49. – Режым доступу: http://www.udcc.ru/MATERIALS/2017/CONFERENCE2017.pdf. – Дата доступу: 17.12.2017.

7. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэбны дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" вышэйшых навучальных устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; [сярод рэц.: В. А. Касап]. – 2–е выд., са змяненнямі. – Мінск : [б. в.], 2011. – С. 25–54. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/13686. – Дата доступу: 17.12.2017.

8. Сукиасян, Э. Р. Будущее Библиотечно-библиографической классификации / Э. Р. Сукиасян // Науч. и техн. б-ки. – 2014. – № 8. – С. 55–65.

9.Сукиасян, Э. Р. Таблицы библиотечно-библиографической классификации. Организация и технология использования : методические рекомендации / Э. Р. Сукиасян ; М-во культуры Рос. Федерации, Рос. гос. б-ка. – Москва : Пашков дом, 2016. – 111 с. – (Инновации в библиотеках).

10. Электронный эталон ББК [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.rsl.ru/ru/2professionals/bbk. – Дата доступа: 08.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Прыватная методыка сістэматызацыі

*Пытанні*

1. Засістэматызаваць па ББК і аформіць у выглядзе каталожнай карткі сістэматычнага каталога (з указаннем поўнага, палічнага і каталожнага індэксаў) дакументы:

па гісторыі, гістарычных навуках;

гуманітарнага зместу;

мастацкай літаратуры.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2006–03–01. – Минск, 2006. – 5 с.

2. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В.Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 133 – 143 ; 162–168.

3. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэбны дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" вышэйшых навучальных устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; [сярод рэц.: В. А. Касап]. – 2–е выд., са змяненнямі. – Мінск : [б. в.], 2011. – С. 44–54. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/13686. – Дата доступу: 17.12.2017

## Тэма 12. Бібліятэчныя каталогі: функцыі, асноўныя прынцыпы стварэння, віды і формы

*Пытанні*

1. Характарыстыка сістэмы каталогаў бібліятэкі (на прыкладзе бібліятэкі – месца працы слухача).
2. Дать характарыстыку пашпартаў каталогаў бібліятэкі (на прыкладзе бібліятэкі – месца працы слухача).

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Богачёва, И.В. Перевод карточных каталогов в электронные: проблемы и перспективы / И.В. Богачёва // Библиография. – 2015. – № 4. – С. 23–36.

2. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм : вучэбна-метадычны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; [сярод рэц.: В. А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Касап]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 108, [1] с. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/13433.
3. Справочно-поисковый аппарат библиотеки : учебник / под ред. И. С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2015. – С. 47–68 ; 94–174.

**Форма бягучай атэстацыі – экзамен.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ БЯГУЧАЙ АТЭСТАЦЫІ

### Пытанні да экзамену

1. Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў, яе сутнасць, асноўныя працэсы.
2. Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў.
3. Дакумент як аб’ект для складання бібліяграфічнага апісання.
4. Віды бібліятэчнай апрацоўкі дакумента.
5. Бібліяграфічны запіс: азначэнне, структура, функцыі, віды.
6. Бібліяграфічнае апісанне як элемент бібліяграфічнага запісу.
7. Агульная характарыстыка «ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления».
8. Загаловак бібліяграфічнага запісу: віды, агульныя патрабаванні і правілы яго складання.
9. «ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления»: агульная характарыстыка.
10. Прадпісаная пунктуацыя і яе выкарыстанне ў бібліяграфічным апісанні.
11. Агульная методыка бібліяграфічнага апісання.
12. Вобласці і элементы бібліяграфічнага апісання: агульная характарыстыка.
13. Вобласць назвы і звестак аб адказнасці. Яе характарыстыка.
14. Вобласці выдання і спецыфічных звестак: асаблівасці фарміравання.
15. Вобласць выхадных даных. Яе характарыстыка.
16. Вобласць фізічнай характарыстыкі.
17. Вобласць серыі. Асаблівасці яе фарміравання.
18. Вобласць заўвагі. Яе характарыстыка.
19. Вобласць стандартнага нумара (або яго альтэрнатывы) і ўмоў даступнасці.
20. Аднаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне. Яго асаблівасці.
21. Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам, які ўключае імя асобы.
22. Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам, які ўключае назву арганізацыі.
23. Бібліяграфічны запіс пад назвай.
24. Дадатковыя бібліяграфічныя запісы. Дапаможныя карткі: характарыстыка.
25. Аналітычнае бібліяграфічнае апісанне.
26. Многаўзроўневае бібліяграфічнае апісанне.
27. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на зборнікі.
28. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на нарматыўна-тэхнічныя і тэхнічныя дакументы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

29. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на дэпаніраваны рукапіс.
30. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на неапублікаваныя дакументы.
31. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на нотныя выданні і аўдыёвізуальныя матэрыялы.
32. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на выяўленчыя і картаграфічныя выданні.
33. Асаблівасці складання бібліяграфічнага запісу на электронныя рэсурсы (электронныя выданні).
34. Тэарэтычныя асновы індэксавання дакументаў.
35. «ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации»: агульная характарыстыка.
36. Сістэматызацыя дакумента: значэнне, агульная методыка, вынік.
37. Агульная характарыстыка бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі (ББК).
38. Сістэма тыпавых дзяленняў ББК.
39. Агульныя тыпавыя дзяленні ББК.
40. Тэрытарыяльныя тыпавыя дзяленні ББК.
41. ББК: моўныя тыпавыя дзяленні.
42. Этнічныя тыпавыя дзяленні ББК.
43. Варыянты табліцы ББК.
44. Індэксацыя табліцы ББК.
45. Асаблівасці сістэматызацыі па ББК дакументаў па гісторыі, гістарычных навуках.
46. Асаблівасці сістэматызацыі па ББК дакументаў гуманітарнага зместу.
47. Методыка сістэматызацыі па ББК мастацкай літаратуры.
48. ГОСТ 7.90–2007 «Универсальная десятичная классификация. Структура, правила ведения и индексирования»»: агульная характарыстыка.
49. «Универсальная десятичная классификация» (УДК): агульная характарыстыка.
50. Каардынатнае індэксаванне: агульная характарыстыка.
51. Методыка каардынатнага індэксавання.
52. Прадметызацыя як від індэксавання дакументаў.
53. Бібліятэчныя каталогі: азначэнне, функцыі, прынцыпы фарміравання, класіфікацыя.
54. Арганізацыя, вядзенне, рэдагаванне традыцыйных карткавых каталогаў.
55. Алфавітны каталог: стварэнне і выкарыстанне арганізацыя, вядзенне, рэдагаванне і выкарыстанне.
56. Сістэматычны каталог: стварэнне і выкарыстанне арганізацыя, вядзенне, рэдагаванне і выкарыстанне.
57. Электронны каталог: стварэнне і выкарыстанне
58. Электронны каталог як інфармацыйна-пошукавая сістэма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

59. Зводны каталог: стварэнне і выкарыстанне.

60. Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі: структура, выкарыстанне.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### *Асноўная*


1. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – Санкт-Петербург : Профессия, 2016. – 319 [1] с.

2. Библиографическое описание книжных изданий : примеры и методические рекомендации : практическое пособие / Нац. б-ка Беларуси ; ред. Т. В. Кузьминич ; рец.: Н. А. Лейко, А. И. Федорина. – Минск, 2014. – 233 с. – (Библио-Консультант ; вып. 1).

3. Библиотечно-библиографическая классификация (ББК) : общий обзор, анализ и оценка Национальной классификационной системы Российской Федерации / Э. Р. Сукиасян. – Москва : Литера, 2014. – 312 с. – (Современная библиотека).

4. Библиотечно-библиографическая классификация: сокращенные таблицы : практическое пособие / Российская государственная библиотека, Российская национальная библиотека, Библиотека Российской академии наук ; [А. С. Адаменко и др.; главный редактор Э. Р. Сукиасян]. – Москва : Пашков дом, 2015. – 669, [2] с.

5. Библиотечно-библиографическая классификация : средние таблицы. – Москва : 2001 – 2018. – Вып. 1 – 7.

6. ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення. – Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82 ; введ. 2004–11–01. – Минск, 2004. – 48 с.

7. ГОСТ 7.12–93. Библиографическая запись. Сокращение слов на русском языке. Общие требования и правила. – Взамен ГОСТ 7.12–77; введ. 1995–07–01. – Минск, 1995. – 15 с.

8. ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2006–03–01. – Минск, 2006. – 5 с.

9. ГОСТ 7.66–92. Индексирование документов. Общие требования к координатному индексированию. – Введ. 01.01.1993. – Москва, 1992. – 5 с.

10. ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления. – Введ. 2001–11–01. – Минск, 2001. – 8 с.

11. ГОСТ 7.82–2001. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления=Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэсурсаў. Агульныя патрабаванні і правілы складання. – Введ. 2003–01–01. – Минск, 2002. – 23 с.

12. ГОСТ 7.90–2007. Универсальная десятичная классификация: структура, правила ведения и индексирования. – Введ.2008–07–01. – Москва : Стандартинформ, 2008. – 22 с.

13. Зайцева, Е. М. Перспективы развития библиотечных классификаций: взгляд систематизатора и автоматизатора [Электронный ресурс] / Е. М. Зайцева // Перспективные направления научных исследований и критические технологии в классификационных системах : научно-практическая конференция, Москва, 25–27 октября, 2017 г. : материалы конференции / ВИНИТИ РАН ; науч. ред. Дмитриева Е.Ю. [и др.]. – Москва, 2017.– С. 44–49. – Режим доступа: http://www.udcc.ru/MATERIALS/2017/CONFERENCE2017.pdf. – Дата доступа: 08.01.2020.

14. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм : вучэбна-метадычны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; [сярод рэц.: В. А. Касап]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 108, [1] с. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/13433.

15. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэбны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. –180 с. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/15728/%d0%9b%d0%b5%d0%b9%d0%ba%d0%be.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступу: 17.12.2017.

16. Ляйко, Н. А. Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэбны дапаможнік / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; [сярод рэц.: В. А. Касап]. – 2–е выд., са змяненнямі. – Мінск : [б. в.], 2011. – 113, [1] с. : табл., схемы. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/13686. – Дата доступу: 17.12.2017.

17. Справочно-поисковый аппарат библиотеки : учебник / под ред. И. С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2015. – С. 47–68 ; 94–174.

18. СТБ 7.12–2001. Бібліяграфічны запіс. Скарачэнне слоў і словазлучэнняў на беларускай мове. Агульныя патрабаванні і правілы=Библиографическая запись. Сокращение слов и словосочетаний на белорусском языке. Общие требования и правила. – Узамен СТБ 7.12–95; увед. 2002–07–01. – Мінск, 2002. – 19 с.

19. СТБ 7.38–2017. Электронные издания. Основные виды и выходные сведения = Электронныя выданні. Асноўныя віды і выхадныя звесткі. – Введен впервые 2017–10–01.– Минск, 2017. – 16 с.

20. СТБ ГОСТ 7.0–2004. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні = Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0–84, ГОСТ 7.26–80; увед. 2005–03–01. – Мінск, 2004. – 35 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. СТБ ГОСТ 7.76–2004. Камплектаванне фонду дакументаў. Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні = Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Уведзены ўпершыню 2005–03–01. – Мінск, 2004. – 47 с.

22. Сукиасян, Э. Р. Таблицы библиотечно-библиографической классификации. Организация и технология использования : методические рекомендации / Э. Р. Сукиасян ; М-во культуры Рос. Федерации, Рос. гос. б-ка. – Москва : Пашков дом, 2016. – 111 с. – (Инновации в библиотеках).

23. Универсальная десятичная классификация. – 4-е полн. изд. на рус. яз. – Москва : ВИНИТИ РАН, 2001–2010. – Т. 1–10.

24. Универсальная десятичная классификация: сокращенное издание / гл. ред. акад. Ю.М. Арский ; ВИНИТИ РАН. – 6-е изд., перераб. и доп. – Москва, 2012. – 163 с.

25. Учебное пособие по Универсальной десятичной классификации / ВИНИТИ РАН ; гл. ред. Ю.М.Арский. – 2-е изд., испр. и доп. – Москва, 2009. – 188 с.

26. Універсальная дзесятковая класіфікацыя: звыш 10000 асноўных і дапаможных класаў / Аб'яднаны інстытут праблем інфармытыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – 367 с.

27. Воронович, С. База данных Универсальной десятичной классификации (БД УДК) / С. Воронович // Бібліятэчны свет. – 2008. –№ 1. – С.24.

28. Хавкина, Л. Б. Таблица авторских знаков двоичных : практ. пособие для библиотекарей / Л. Б. Хавкина. – 25-е изд. / под ред. Ю. Н. Столярова. – Москва : Либерея, 1992. – 24 с.

### *Дадатковая*

1. Асеева, И. Ю. О разработке проекта Изменения №1 к ГОСТу 7.1–2003 «СИБИД. Библиографическая запись. Библиографтческое описание. Общие требования и правила составления» / И. Ю. Асеева // Библиография. – 2015. – №5. – С. 36–39.

2. Библиотечно-библиографические классификационные системы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/bibliotekaryam/bibliotechno-bibliograficheskie-klassifikatsionnye-sistemy/. – Дата доступа: 08.01.2020.

3. Богачёва, И. В. Перевод карточных каталогов в электронные: проблемы и перспективы / И. В. Богачёва // Библиография. – 2015. – № 4. – С. 23–36.

4. Государственный рубрикатор научно-технической информации. (Рубрикатор ГАСНТИ). – 6-е изд. – Москва, 2007. – 136 с.

5. Захарчук, Т. В. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебно-практическое пособие / Т. В. Захарчук, И. П. Кузнецова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2011. – 103 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Зупарова, Л. Б. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Л. Б. Зупарова, Т. А. Зайцева. – Москва : ФАИР, 2008. – 399, [1] с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

7. Інструментарый індэксатара і яго прымяненне ў бібліятэках Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – 191, [1] с. – (Серыя "БібліяКансультант").

8. Ишутина, Е. Из опыта создания региональной сети сводного электронного каталога библиотек Беларуси / Елена Ишутина, Лилия Фисенко // Бібліятэчны свет. – 2018. – № 2. – С. 21–22.

9. Ляйко, Н. А. Электронныя каталогі бібліятэк Беларусі як інфармацыйна-пошукавыя сістэмы / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навуковай канферэнцыі (Мінск, 28 лістапада 2014 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2016. – С. 146–152. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/17397. – Дата доступу: 17.12.2017.

10. Материалы по систематизации НИЦ ББК [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nilc.ru/?p=met. – Дата доступа: 08.01.2020.

11. Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў : навук.-метад. выданне / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. –190, [1] с. – (Серыя «БібліяКансультант»).

12. Нацыянальныя дакументы Беларусі: методыка і тэхналогія сучаснай бібліятэчнай працы : навукова-метадычнае выданне / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – 218, [1] с. – (Серыя «БібліяКансультант» ; вып. 7).

13. Справочник библиотекаря / В. В. Брежнева, И. Г. Васильев, Г. Ф. Гордукалова ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – 4-е изд. перераб. и доп. – СПб. : Профессия, 2011. – С. 93–97.

14. Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. редакторы: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. — С. 382–515.

15. Сукиасян, Э. Р. Библиотечные каталоги : методические материалы / Э. Р. Сукиасян. – М. : Профиздат, 2003. – 191 с.

16. Сукиасян, Э. Р. Будущее Библиотечно-библиографической классификации / Э. Р. Сукиасян // Научные и технические библиотеки. – 2014. – № 8. – С. 55–65.

17. Сукиасян, Э. Р. Введение в современную каталогизацию : пособие для проф. самообразования / Э. Р. Сукиасян. – М. : Литера, 2012. – 320 с.

18. Сукиасян, Э.Р. Система каталогов. Как мы её долго строили и как быстро ликвидировали / Э. Р. Сукиасян // Научные и технические библиотеки. – 2019. – №6. – С.28–40.– То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ntb.gpntb.ru/jour/article/view/439/433. – Дата доступа: 08.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. УДК Консорциум | Россия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://forum.udcc.ru/. – Дата доступа: 08.01.2020.

20. Электронный эталон ББК [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.rsl.ru/ru/2professionals/bbk. – Дата доступа: 08.01.2020.

21. UDC Consortium [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.udcc.org/. – Дата доступа: 08.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ